# СПЕЦЫФІКА АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЕКТНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

**Падаляк Т.Ю.,** студэнтка 4 курса
(г. Мінск, БДПУ імя Максіма Танка)
Навуковы кіраўнік – Васілеўская А.С., канд. філал. навук, дацэнт

Асноўная мэта ўрокаў літаратурнага чытання ў пачатковых класах –падвесці навучэнцаў да ўсведамлення багатага свету айчыннай і замежнай дзіцячай літаратуры як мастацтва з асаблівым мастацкім словам, узбагаціць чытацкі вопыт малодшых школьнікаў.

Адным са сродкаў дасягнення гэтай мэты з’яўляецца праектная дзейнасць. Супастаўленне паняццяў «праект», «праектаванне», «праектная дзейнасць школьнікаў» паказвае, што яны не тоесныя адзін аднаму, хоць іх змест мае шмат агульнага.

У шырокім значэнні слова праект – гэта план, задума пэўнага аб'екта, дзеяння. Адукацыйны праект акрэсліваецца як форма арганізацыі заняткаў, якая прадугледжвае комплексны характар дзейнасці яе ўдзельнікаў па атрыманні адукацыйнай прадукцыі за пэўны прамежак часу – ад аднаго ўрока да некалькіх месяцаў [1, с. 325].

Праектаванне ў навуковай літаратуры разумеецца як спарадкаваная дзейнасць, накіраваная на стварэнне праекта [2, с. 197]. А метад праектаў можна акрэсліць як спосаб навучання школьнікаў праз арганізацыю даследчай і творчай дзейнасці па стварэнні праектаў пры рашэнні пэўнай праблемы [3, с. 19].

Праектная дзейнасць школьнікаў – форма вучэбна-пазнавальнай актыўнасці, якая заключаецца ў матываваным дасягненні свядома пастаўленай мэты па стварэнні праекта, якая забяспечвае адзінства і пераемнасць розных бакоў працэсу навучання і якая з'яўляецца сродкам развіцця асобы суб'екта навучання [4, с. 18].

Такім чынам, можна вылучыць шэраг рыс, якія адрозніваюць праектную дзейнасці ад іншых відаў вучэбнай дзейнасці: творчая і даследчая актыўнасць, вырашэнне пэўнай праблемы або дасягненне выразна акрэсленай мэты, комплексны (міжпрадметны) характар дзейнасці. Менавіта таму арганізаваць і рэалізаваць праект у пачатковых класах дастаткова праблематычна, таму што ў дзяцей яшчэ мала чытацкага, навучальнага, пошукавага вопыту.

Але менавіта малодшы школьны ўзрост з'яўляецца пачатковым этапам для далучэння вучняў да праектнай дзейнасці, на якім закладваецца падмурак далейшага авалодання гэтым відам дзейнасці. Засваенне вопыту ажыццяўлення праектнай дзейнасці аказвае ўплыў на эмацыйна-пачуццёвую, пазнавальную і валявую сферы, спрыяе развіццю творчай актыўнасці, фарміруе такія якасці, як працавітасць, добрасумленнае стаўленне да вучэбнай дзейнасці. Навучэнец вучыцца ставіць перад сабой канкрэтныя задачы, планаваць магчымыя спосабы і вызначаць паслядоўнасць іх вырашэння, самастойна працуе над ажыццяўленнем праекта, аналізуе і ацэньвае атрыманыя вынікі.

У праектнай дзейнасці школьнікаў вылучацца наступныя этапы:

І этап – матывацыйны. На гэтым этапе настаўнік заяўляе агульную тэму, стварае станоўчы матывацыйны настрой, а вучні абмяркоўваюць, прапаноўваюць уласныя ідэі.

ІІ этап – падрыхтоўчы. На ім вызначаюцца мэты праекта, фармулююцца задачы, выпрацоўваецца план дзеянняў, усталёўваюцца крытэрыі ацэнкі выніку і працэсу, узгадняюцца спосабы сумеснай дзейнасці спачатку з максімальнай дапамогай настаўніка, а пазней самастойна.

ІІІ этап – інфармацыйна-аперацыйны. Вучні збіраюць матэрыял, працуюць з літаратурай і іншымі крыніцамі, непасрэдна выконваюць праект. Настаўнік назірае, каардынуе, падтрымлівае працу, сам з'яўляецца інфармацыйнай крыніцай.



Репозиторий ВГУ

IV этап – рэфлексійна-ацэначны. Вучні прадстаўляюць праекты, удзельнічаюць у калектыўным абмеркаванні і змястоўнай ацэнцы вынікаў і працэсу працы, ажыццяўляюць вусную ці пісьмовую самаацэнку, настаўнік выступае ўдзельнікам калектыўнай ацэначнай дзейнасці [5, с.21].

Для паспяховай рэалізацыі праектнага навучання неабходна выкананне пэўных педагагічных умоў:

- прадстаўленне навучэнцам магчымасці аргументавана выбраць тэму праекта, выкарыстоўваючы «банк праектаў», спланаваць будучую працу і рэалізаваць свой праект, затым прадставіць яго ў выглядзе пэўнага гатовага «прадукта»;
- арганізацыя працы навучэнцаў па размеркаванні «падтэм» у мікрагрупах, а таксама функцый кожнага члена групы;
- стымуляванне праяў пошукавай актыўнасці вучняў на асобных этапах выканання праекта;
- аказанне навучэнцам педагагічнай падтрымкі і іх заахвочванне ў выкарыстанні розных напрамкаў пошуку інфармацыі;
- кансультаванне, якое ажыццяўляецца на ўсіх этапах працы па выкананні праекта;
- прэзентацыя ўдзельнікамі праекта атрыманага адукацыйнага прадукту, які мае тэарэтычную і практычную значнасць;
- ажыццяўленне навучэнцамі самаацэнкі выкананай працы.

Кожны этап мае свае мэты і задачы, якія неабходна адаптаваць для пачатковых класаў з улікам узроставых, псіхалагічных асаблівасцяў малодшых школьнікаў, а таксама тых ведаў і ўменняў, якія яны набылі раней.

Так, пры выбары тэмы праекта “Гуканне вясны” ў 3 класе дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 61 г. Мінска” мы зыходзілі з таго, што якраз у час рэалізацыі праекта праграмай па літаратурным чытанні прадугледжана вывучэнне раздзела “Вясенні дзень год корміць”, у якім адбываецца знаёмства навучэнцаў з вяснянымі песнямі.

У працэсе рэалізацыі праекта мы імкнуліся падабраць заданні з улікам узроставых асаблівасцей малодшых школьнікаў: так, першая група навучэнцаў павінна была зрабіць птушак з паперы, а другая – птушак з цеста; трэцяя група збірала загадкі па тэме праекта; чацвёртая – рыхтавала выкананне танца і песень-вяснянак; удзельнікі пятай групы павінны былі падабраць і развучыць гульню, а ўдзельнікі шостай – падрыхтаваць малюнкі на тэму “Гуканне вясны”. Былі ўлічаны і аспекты дыферэнцыянальнага навучання. Так, адораным вучням было прапанавана правесці міні-даследаванне і адказаць на пытанні: *Для чаго патрэбны абрад “Гуканне вясны”? З якіх элементаў ён складаецца?*

У час працы над праектам на ўсіх этапах яго рэалізацыі школьнікам была аказана дапамога. У першую чаргу, дапамагалі класны настаўнік, настаўнік музыкі, харэограф. Вялікую працу па рэалізацыі праекта зрабілі і бацькі (адным з мерапрыемстваў на падрыхтоўчым этапе стала правядзенне бацькоўскага сходу). Былі запрошаны і кансультанты, якія дапамаглі разабрацца ў спецыфіцы правядзення абарада “Гуканне вясны”.

Заключным этапам стала правядзенне фальклорнага свята “Гуканне вясны”, у якім прынялі ўдзел усе ўдзельнікі праекта.

Думаецца, што гэты праект даў вучням незаменны вопыт сумеснай дзейнасці. Калі вучань здолее справіцца з працай над вучэбным праектам, можна спадзявацца, што і ў дарослым жыцці ён апынецца больш прыстасаваным: здолее планаваць уласную дзейнасць, зможа арыентавацца ў разнастайных сітуацыях, сумесна працаваць з рознымі людзьмі, г. зн. адаптавацца да зменных умоў жыцця.

**Спіс цытаваных крыніц:**

1. Хуторской, А. В. Современная дидактика : учеб. пособие / А. В. Хуторской. – М. : Высшая школа, 2007. – 639 с.

Репозиторий ВГУ

2. Полат, Е. С. Современные педагогические и информационные технологии в системе образования / Е. С. Полат, М. Ю. Бухаркина. – М. : Академия, 2010. – 368 с.
3. Миранкова, Е. В. Организация проектной деятельности учащихся на уроках трудового обучения в начальных классах / Е. В. Миранкова // Весці БДПУ. – № 1. – 2014. – С. 19–23.
4. Матяш, Н. В. Инновационные педагогические технологии. Проектное обучение / Н. В. Матяш. – М. : Академия, 2014. – 160 с.
5. Как проектировать универсальные учебные действия: от идеи к мысли : пособие для учителя / под ред. А. Г. Асмолова. – М. : Просвещение, 2010.

## ВНЕДРЕНИЕ ТЕХНОЛОГИИ СМЕШАННОГО ОБУЧЕНИЯ В ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ МАЛОКОМПЛЕКТНОЙ ШКОЛЫ

**Панова Н.Д.,** магистрант 2 курса
(г. Псков, ФГБОУ ВО «Псковский государственный университет»)
Научный руководитель – Сергеева Л.А., канд. пед. наук, доцент

Сегодня мы имеем возможность использовать современные инструменты, позволяющие нам существенно изменить взгляд на обучение. И одним из таких инструментов является технология смешанного обучения. Но возможно ли использовать данную технологию в образовательной деятельности малокомплектной школы?

Учебный процесс в малокомплектной школе имеет ряд важнейших особенностей, которые обусловлены тем, что уроки в них проводит один учитель одновременно с двумя, тремя, а то и четырьмя классами в одном помещении. Проведение занятий одновременно с детьми разного возраста, разной подготовленности по учебным программам требует от учителя малокомплектной школы более тщательной подготовки, правильной организации учебного процесса, умения разрабатывать задания, ориентируясь на индивидуальные потребности учеников. Важно уделять внимание и слабым, и сильным ученикам.

Введение в образовательный процесс смешанного обучения позволит учителю создавать условия для раскрытия и формирования индивидуальности каждого ребенка [1]. Небольшое количество учеников в сельской школе, малая наполняемость классов дает возможность учителю осуществлять смешанное обучение с учётом особенностей развития учащихся, уровня их знаний и умений.

Анализируя литературу, посвящённую смешанному обучению, можно сказать, что термин «смешанное обучение» трактуется разными педагогами по-разному. Например, А.В. Логинова [2] определяет рассматриваемую форму обучения как метод, который сочетает в себе традиционное обучение «лицом к лицу» и некоторые элементы дистанционного обучения. Другой представитель отечественной педагогики И.А. Малинина [3] предлагает иное определение смешанного обучения, и она считает, что смешанное обучение – это комбинирование «живого» обучения с обучением при помощи Интернет-ресурсов, в первую очередь второго поколения, позволяющих осуществлять совместную деятельность участников образовательного процесса.

Исследователи Х. Стейкер и М. Хорн [4] считали, что смешанное обучение – это образовательный подход, совмещающий в себе обучение с непосредственным участием учителя и онлайн-обучение, предполагающий элементы самостоятельного контроля учеником пути, времени, места и темпа обучения, а также объединение опыта обучения с учителем и онлайн обучение.

Смешанное обучение в малокомплектной школе позволяет дать возможность каждому ученику достичь максимального контакта с преподавателем, почувствовать персональный интерес преподавателя к нему.



Репозиторий БГУ